Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка"

# "СЛАВЯНСКІ СВЕТ: МІНУЛАЕ І СУЧАСНАЕ"

Матэрыялы Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі

## 26 сакавіка 2004 года

У 3-х частках

Частка 3

Мінск 2004

УДК 94(476) (043.2)
ББК 63.3 (4 БеИ)
Г 51

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ імя М. Танка

***Рэдакцыйная калегія:*** А.П. Жытко (галоўны рэдактар), С.П. Барадзін, А.М. Люты, У.В. Тугай, В.М. Фамін, В.Р. Федарасава

***Рэцэнзенты:*** У.М. Міхнюк, доктар гістарычных навук, прафесар
С.Я. Новікаў, доктар гістарычных навук, прафесар

Г 51 Славянскі свет: мінулае і сучаснае: Матэрыялы Рэсп. навук. канф., 26 сакавіка 2004 г.; Рэдкал.: А.П. Жытко (гал. рэд.) і інш. - Мн.: БДПУ, 2004. - с. 182.

Асвятляюцца актуальныя пытанні гісторыі славянскіх народаў ад старажытнасці да нашых дзён. Прызначаецца навукоўцам, выкладчыкам і студэнтам вышэйшых навучальных устаноў.

УДК 94(476)(043.2)
ББК 63.3(4 БеИ)

ISBN 985-435-155-6 (ч. 3)

© БДПУ імя М. Танка, 2004

# РАЗВЯЗВАННЕ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

*М.В. Цуба*
*г. Пінск*

У абставінах нарастання ваеннай небяспекі ў канцы XIX пачатку XX стагоддзяў Еўропа раскалолася на дзве супрацьстаячыя групоўкі. Адна з іх была створана на аснове саюза Германіі і Аўстра-Венгрыі, які быў падпісаны ў 1879 годзе і накіраваны супраць Францыі і Расіі. Да гэтага саюза ў хуткім часе прымкнула Італія. Кааліцыя гэтых дзяржаў атрымала назву - Траісты саюз, альбо Цэнтральныя краіны. Другая групоўка - Антанта пачала складвацца з шэрагу падпісаных дагавораў паміж Францыяй і Расіяй у 1891 - 1893 гг. І канчаткова была створана ў 1907 годзе, калі да Францыі і Расіі далучылася Англія.

Абедзве групоўкі рупліва рыхтаваліся да ваенных дзеянняў, распрацоўваючы свае стратэгічныя планы з разлікам на хуткі разгром сваіх праціўнікаў. У выніку былі створаны шматмільённыя арміі. Германа-аўстрыйскі блок налічваў больш за 3,5 млн. чалавек (193 дывізіі), а дзяржавы Антанты - звыш 6 млн. чалавек (291 дывізія).

Галоўнымі прычынамі канфлікту былі барацьба буйнейшых еўрапейскіх дзяржаў за першынства на сусветным рынку, за пераразмеркаванне раней прыдбаных калоній, за ўплыў на тыя ці іншыя рэгіёны свету, за авалоданне сыравінай. Не апошнюю ролю адыгралі псіхалагічныя падыходы, амбіцыі, нацыянальны гонар і г. д.

І усё ж нельга не пагадзіцца з англійскім даследчыкам Б. Дзідэл-Гартам, які ў сваёй працы "Праўда аб вайне 1914-1918 гг." адзначыў, што яе "першая іскра была высечана на Балканах у 1908г." [1, 12]. Менавіта 7 кастрычніка 1908 года Аўстра-Венгрыя заявіла аб анэксіі акупіраваных ёю былых асманскіх правінцый Босніі і Герцагавіны. Дадзеная анэксія выклікала моцнае раздражэнне з боку балканскіх краін і асабліва Сербіі, якая, спадзяючыся на падтрымку Расіі, прэтэндавала на гэтыя ж правінцыі, таму што ў іх значна пераважала насельніцтва сербскага паходжання. З нагоды гэтага ў 1908 і ў 1910гг. у Празе і Сафіі адбыліся з'езды вядомых славянскіх дзеячаў краін Паўднёвай Еўропы, арганізаваныя доктарам К. Крамарэнам. Дэлегаты з'ездаў адзінагалоса заклікалі Расійскую імперыю стаць абаронцай славянства ад аўстрагерманскага ціску і прыгнёту [2, 391]. Будучы ў стане ваеннай слабасці, пасля паражэння ў вайне з Японіяй і няўпэўненная ў падтрымцы партнёраў па Антанце Расія не магла аказаць Сербіі дзейсную дапамогу. Імператар Мікалай II, выражаючы незадавальненне палітыкай аўстравенгерскай экспансіі на Балканах, у якой Германія выступіла на баку

сваёй саюзніцы, усё ж імкнуўся да захавання з Германіяй і асабіста з Вільгельмам II добрасуседскіх адносін.

У выніку Сербія была вымушана пайсці на ўступкі Аўстра-Венгрыі. Аднак рэзультаты анэксійнага крызісу працягвалі аказваць уздзеянне на міжнародныя адносіны да самага пачатку вайны.

Адначасова з вышэй адзначаным крызісам адбылося абвастрэнне англа-германскіх адносін у сувязі з правалам перамоваў дыпламатаў гэтых краін па пытаннях будаўніцтва ваенна-марскога флоту. Акрамя таго, адбылося паглыбленне супярэчнасцей паміж Германіяй і Францыяй, звязанае не толькі з імкненнем французаў вярнуць страчаныя правінцыі Эльзас і Латарынгію, але ў сувязі і з каланіяльнымі праблемамі на тэрыторыі Марока. У 1913 годзе сарвалася падпісанне дагавора паміж Англіяй і Германіяй аб падзеле партугальскіх калоній.

Хутка ўзнік новы крызіс "мабілізацыйны", які рэальна пагражаў узнікненнем агульнаеўрапейскай вайны. Ён быў звязаны з супярэчнасцямі паміж Расіяй і Аўстра-Венгрыяй у сувязі з іх імкненнямі ўстанавіць свой уплыў на Балканах. Падчас першай балканскай вайны ў кастрычніку-лістападзе 1912 года ў Аўстра-Венгрыі была праведзена поўная мабілізацыя арміі. Яе войскі і ваенная тэхніка былі перакінуты да граніц Сербіі і Расіі. Імкнучыся да поўнага кантролю на Балканскім паўвостраве аўстра-венгерскі ўрад дамогся ажыццяўлення незалежнасці Албаніі. Стварэнне Албаніі пад апякунствам Аўстра-Венгрыі перакрыла так неабходны доступ да Адрыятычнага мора Сербіі, што яшчэ больш накаліла напружанасць у гэтым рэгіёне. Балканскія войны 1912-1913 гг. прывялі не толькі да абвастрэння руска-аўстрыйскіх супярэчнасцяў, але і прадэманстравалі ў значнай ступені падтрымку Германіяй аўстра-венгерскай экспансіі на Балканах. Тым не менш стрымліваючае ўздзеянне Германіі на свайго саюзніка і, адпаведна, Англіі на Расійскую імперыю прадухіліла у гэты час перарастанне Балканскіх войн у еўрапейскую вайну.

Сутыкненне інтарэсаў Расіі, Англіі з аднаго боку і Германіі з другога праявілася і ў будаўніцтве Германіяй чыгункі Берлін-Канстанцінопаль-Багдад, якая мела вялікае стратэгічнае значэнне і давала магчымасць пранікнення германскага ўплыву на Турцыю і суседнія з ёй краіны.

Фактычна апошнім міжнародным канфліктам напярэдадні першай сусветнай вайны, з'явіўся руска-германскі канфлікт з-за ваеннай місіі Лімана Фон Сандэрса. Работа германскай ваеннай місіі была засяроджана на Чарнаморскіх пралівах, якія з'яўляліся аб'ектам найбольшай геапалітычнай і эканамічнай зацікаўленнасці Расійскай імперыі. Вясной 1914 года пад кіраўніцтвам нямецкіх ваенных спецыялістаў былі выка-

наны работы па ўмацаванню крэпасных збудаванняў, састаўлены план мініравання праліваў Басфор і Дарданеллы, артылерыя берагавых ўмацаванняў была пераўзброена сучаснымі нямецкімі гарматамі. Ваенны кантроль над Чарнаморскімі пралівамі амаль поўнасцю ажыццяўляўся Германіяй, якая працягвала да самага пачатку вайны павялічваць колькасць сваіх войск у Турцыі. Менавіта, канфлікт з-за місіі Лімана Фон Сандэрса стаў тым канчатковым штуршком, які прывёў да рэзкага пагаршэння руска-германскіх адносін. Нездарма падчас гэтага канфлікту на данясенні нямецкага пасла ў Расіі Ф. фон Пурталеса Вільгельм II напісаў наступнае: "Руска-прускія адносіны памерлі раз і назаўсёды! Мы сталі ворагамі!" [3, 512].

У сваю чаргу, на нарадзе вышэйшага кіраўніцтва Расійскай імперыі пад старшынствам В.Н. Какоўцава, у якім прынялі ўдзел ваенны міністр В.А. Сухамлінаў, марскі міністр І.К. Грыгаровіч, міністр замежных спраў С.Д. Сазонаў і начальнік Генштаба Я.Г. Жылінскі, Сазонаў выступіў за прыняцце прымусовых мер у адносінах да Турцыі, такіх як фінансавы байкот, разрыў дыпламатычных зносін і нават захоп пэўных пунктаў на турэцкай тэрыторыі. Аднак усё гэта ён лічыў магчымым ажыццявіць толькі пры падтрымцы Англіі і Францыі. Тады Какоўцаў паставіў пытанне наконт магчымай у такім разе вайны з Германіяй. Сазонаў згадзіўся з тым, што вайна з Германіяй непажадана, але ваенны міністр і начальнік Генштаба запэўнілі аб поўнай гатоўнасці Расіі да такой вайны, не гаворачы ўжо аб вайне з Аўстра-Венгрыяй. Падобная заява з'явілася прызнаннем магчымасці і дапусцімасці вайны з Цэнтральнымі дзяржавамі [4, 31].

Хаця галоўнымі прычынамі першай сусветнай вайны былі эканамічныя супярэчнасці ваенна-палітычных блокаў Антанты і Траістага саюза, палітычныя разыходжанні і спрэчкі паміж імі, усё ж канкрэтнай падставай да вайны з'явілася драма, звязаная з нацыянальна-вызваленчым рухам славян супраць аўстра-венгерскага панавання. Пасля анэксіі Босніі і Герцагавіны Аўстра-Венгрыяй (1908г.), на тэрыторыі Босніі была створана арганізацыя "Чорная рука" кіраўніцтва якой ажыццяўляў былы палкоўнік сербскай разведкі Апіса Дзмітрыевіч [5, 2]. Галоўнай мэтай гэтай арганізацыі з'яўлялася стварэнне незалежнай дзяржавы ў выніку аб'яднання Сербіі і Босніі. Арганізацыя мела свае адгалінаванні ў выглядзе асобных баявых атрадаў: "Млада Босна", "Народна одбрана" і інш. у залежнасці ад мэт і спецыфікі выканання заданняў, а таксама ўзросту. За перыяд 1910-1914 гг. імі быў ажыццяўлены шэраг тэрарыстычных учынкаў супраць living рознага рангу аўстра-венгерскіх чыноўнікаў на землях Босніі, якія былі анэксіраваны ў склад Аўстра-Венгрыі. Але

асаблівую нянавісць у прадстаўнікоў нацыянальна-вызваленчага руху выклікалі члены імператарскай сям'і Аўстра-Венгрыі і асабіста эрцгерцаг Франц Фердынанд. План якога заключаўся ў прадастаўленні больш шырокіх правоў і магчымасцей славянскаму насельніцтву для актыўнага ўдзелу яго ў кіраўніцтве дзяржавай. Аднак такім накірункам дзейнасці Франца Фердынанда былі незадаволены ўсе: аўстрыйскія і венгерскія чыноўнікі не жадалі адмовіцца ад тых пераваг, якімі валодалі іх народы ў палітычнай структуры імперыі; у сваю чаргу лідэры славянскага нацыянальна-вызваленчага руху баяліся, што разладзяцца іх планы па стварэнню ўласнага паўднёва-славянскага каралеўства [6, 1].

Пад канец чэрвеня 1914 года Аўстра-Венгрыя ў мэтах псіхалагічнага ўздзеяння на Сербію, вырашыла правесці на баснійскай тэрыторыі побач з сербскай граніцай, ваенныя манёўры. Даведаўшыся, што 28 чэрвеня 1914 года на адкрыццё манёўраў у Сараева прыедзе нашчадак аўстра-венгерскага трону, кіраўніцтва "Чорнай рукі" паставіла задачу выкарыстаць зручны момант для замаху.

Франц Фердынанд каб падкрэсліць сяброўскі накірунак візіту прыхапіў у паездку сваю жонку Софію Хотэк. Ён загадаў, каб войскі былі аддалены падчас праезду, тым самым не перашкаджалі свабоднаму доступу народа да яго асобы. Гэта было выкарыстана змоўшчыкамі. Падчас руху картэжа ў машыну наследніка кідалі букеты кветак. У адным з іх прыляцела бомба, якая трапіла ў падол аддзеня Софіі Хотэк, адскочыла назад і ўзарвалася пад калёсамі наступнага аўтамабіля. Двое афіцэраў аховы былі паранены, а кідальнік бомбы Нядзелька Чабрынавіч тут жа арыштаваны. Нягледзячы на інцыдэнт Франц Фердынанд працягнуў паездку да ратушы, дзе была праведзена тэрміновая нарада і прынята рашэнне аб змяненні маршрута выезду з горада. Аднак па дзіўнаму збегу абставін, шафёр эрцгерцага пераблытаў маршрут, паехаўшы па старому шляху, дзе іх чакалі выканаўцы тэракта з "Млада Босны" - Гаўрыла Прынцып і Даніла Ііч. Першы з іх ўскочыўшы на падножку адкрытага аўтамабіля, выстраламі з рэвальвера застрэліў Франца Фердынанда і яго жонку [7, 1]. Вядома, што арганізатары тэрарыстычнага акта Дзмітрыевіч і Ііч былі пакараны. А непасрэдныя выканаўцы Прынцып і Чабрынавіч у сувязі з іх малалецтвам заключаны ў аўстрыйскую турму.

Так сараеўскія выстралы палажылі пачатак палітычнай і ваеннай актыўнасці ў Еўропе. Амаль месяц аўстрыйскі ўрад на чале з імператарм Францам Іосіфам рыхтаваў адказ Сербіі. 23 ліпеня Аўстра-Венгрыя прад'явіла Сербіі ўльтыматум з тэрмінам у 48 гадзін. Большасць з пунктаў ультыматума Сербія згадзілася выканаць. Выключэнне складалі ў гэтым плане 2 пункты: 1) допуск аўстрыйскіх следчых на сербскую тэрыторыю і 2) увядзенне на тэрыторыю краіны абмежаванага кантынгента аўстра-венгерскіх войск, што закранала суверэнітэт і нацыя-

нальную годнасць праваслаўнай славянскай дзяржавы. Нягледзячы на тое, што асноўныя пункты ўльтыматума былі выкананы, раніцай 28 ліпеня 1914 года аўстра-венгерскі ўрад тэлеграмай аб'явіў вайну Сербіі. Высоўваючы версію аб славянскай пагрозе, кіруючыя колы Аўстра-Венгрыі з дапамогай вайны вырашылі стабілізаваць унутранае становішча ў імперыі і памяшаць Сербіі аб'яднаць вакол сябе суседнія славянскія народы. На карысць вайны з Сербіяй, Аўстра-Венгрыі таксама ўказвала непадрыхтаванасць да яе сербскай заступніцы Расійскай імперыі і звышгатоўнасць Германіі падтрымаць сваю саюзніцу. 29 ліпеня адбылася бамбардзіроўка Белграда і іншых гарадоў Сербіі.

31 ліпеня Мікалай II аб'явіў усеагульную мабілізацыю. Германія неадкладна запатрабавала яе адмяніць. Аднак, патрабуючы ад урада Расійскай імперыі тэрміновай адмены усеагульнай мабілізацыі, германскае кіраўніцтва не зрабіла ніякіх спроб паўплываць на ўтаймаванне ваяўнічых задум урада ў Вене, аб чым настойліва прасіў расійскі бок. Такі падыход рабіў прапанову Германіі для Расіі непрымальнай.

Атрымаўшы адказ, раніцай 1 жніўня 1914 года германскі пасол у Расіі граф Ф. Пурталес перадаў міністру замежных спраў С. Сазонаву ноту з аб'явай вайны. У гэты ж дзень Італія зрабіла аб'яву аб сваім нейтралітэце ў пачаўшымся ваенным канфлікце, тлумачачы, што ён пачаўся з-за агрэсіўных дзеянняў Аўстра-Венгрыі супраць Сербіі. А па-гэтаму не можа разглядацца як выпадак выканання саюзных абавязкаў для Італіі. 2-3 жніўня Францыя заявіла аб падтрымцы Расіі, а Англія аб падтрымцы Францыі. 6 жніўня Аўстра-Венгрыя аб'явіла вайну Расіі. Вайна стала еўрапейскай, а ў хуткім часе і сусветнай. У ваенных дзеяннях прынялі ўдзел 38 дзяржаў, у якіх пражывала звыш 1,5 млрд. чалавек, ці ? насельніцтва Зямлі.

## Літаратура


1. Цитата по статье: Туполев Б.М. Происхождение первой мировой войны. // Новая и новейшая история. 2002. № 5.

2. Пушкарёв С.Г. Обзор русской истории. - Ставрополь, 1993.

3. Тэйлор А.Дж. П. Борьба за господство в Европе. 1848-1918. - М., 1958. С. 630

4. Туполев Б.М. Указ. Соч.

5. http://www.vechny.com/history/hs0402_1.htm

6. file://c:\Documents and Settings\cub...\Первоя мировая война и Россия. Сорокина. ht

7. http://defacto.examen.ru/db/Examine Base/catdoc_id/5323FF2D1F5D543.../defacto.htm

# ЗМЕСТ

*Секцыя 3* .......... 3

ГІСТОРЫЯ РАСІІ І УКРАІНЫ .......... 3

**Мазарчук Д.В.**
"ПРОБЛЕМЫ ТИПОЛОГИИ ДОГОСУДАРСТВЕННЫХ И РАННЕГОСУДАРСТВЕННЫХ ФОРМ ПОЛИТИЧЕСКОЙ ОРГАНИЗАЦИИ У ВОСТОЧНЫХ СЛАВЯН (О КОНЦЕПЦИИ "ДРУЖИННОГО ГОСУДАРСТВА")" .......... 3

**Пракоп А.К.**
"РОССИЙСКОЕ ГОСУДАРСТВО И РИМСКАЯ КУРИЯ В СОБЫТИЯХ СМУТНОГО ВРЕМЕНИ" .......... 9

**Кадзіра У.М.**
"СЕВЕРИН НАЛИВАЙКО - РУКОВОДИТЕЛЬ КАЗАЦКО-КРЕСТЬЯНСКОГО ВОССТАНИЯ НА УКРАИНЕ И В БЕЛАРУСИ" .......... 15

**Выбарны В.Д., Маразевіч В.Л.**
"ОТНОШЕНИЯ РОССИИ С РЕЧЬЮ ПОСПОЛИТОЙ ОТ ДЕУЛИНО ДО СМОЛЕНСКОЙ ВОЙНЫ" .......... 20

**Груца І.А.**
"ИСТОРИОГРАФИЯ ПРОБЛЕМЫ СУДЬБЫ МОСКОВСКИХ ТРОФЕЕВ НАПОЛЕОНА" .......... 27

**Швед В.В.**
"СЛАВЯНСКІ СВЕТ У ПОГЛЯДАХ ДЗЕКАБРЫСТАЎ" .......... 36

**Лепеш А.В.**
"ПОЗИЦИЯ КОМИТЕТА ЗАПАДНЫХ ГУБЕРНИЙ ПО РЕШЕНИЮ КРЕСТЬЯНСКОГО ВОПРОСА В ЗАПАДНОМ КРАЕ В 30-40-Х ГГ. XIX ВЕКА" .......... 42

**Жыхараў С.Б.**
"ИЗ ИСТОРИИ СОЗДАНИЯ ФИНАНСОВЫХ ПИРАМИД В РОССИИ: ГЛАВНОЕ ОБЩЕСТВО РОССИЙСКИХ ЖЕЛЕЗНЫХ ДОРОГ (1857-1861 ГГ.)" .......... 49

**Кужэльны А.І.**
"ИСТОРИЧЕСКИЕ АСПЕКТЫ ОБЕСПЕЧЕНИЯ БЕЗОПАСНОСТИ ИНОСТРАННЫХ ПОСОЛЬСТВ" .......... 55

**Заікін Н.А.**
"ПОДГОТОВКА ТАМОЖЕННОЙ УНИИ МЕЖДУ РОССИЙСКОЙ ИМПЕРИЕЙ И КОРОЛЕВСТВОМ ПОЛЬСКИМ (1815-1819 ГГ.)" .......... 60

**Калацэй М.Я.**
"А. МИЦКЕВИЧ И А.С. ПУШКИН В РУССКОЙ КУЛЬТУРЕ XIX ВЕКА" .......... 67

**Цiток У.А.**
"О НЕКОТОРЫХ СТРАНИЦАХ ИЗ ИСТОРИИ ПЕТРА ВЕЛИКОГО В КНИГЕ И.Л. СОЛОНЕВИЧА "НАРОДНАЯ МОНАРХИЯ"" .......... 73

**Лаўрыновiч Д.С.**
"КОНСТИТУЦИОННО-КАТОЛИЧЕСКАЯ ПАРТИЯ ЛИТВЫ И БЕЛАРУСИ: ИДЕОЛОГИЯ, ОРГАНИЗАЦИЯ, ТАКТИКА (1905 - 1914 ГГ.)" .......... 82

**Табуноў В.В.**
"НАЦИОНАЛЬНЫЙ ВОПРОС В ПРОГРАММНЫХ ДОКУМЕНТАХ ЛИБЕРАЛЬНО-ДЕМОКРАТИЧЕСКИХ И КОНСЕРВАТИВНО-МОНАРХИЧЕСКИХ ПАРТИЙ РОССИИ И БЕЛАРУСИ" .......... 86

**Бабровiч А.А.**
"ГЕОРГИЙ ГАПОН И ВОПРОС НАЧАЛА ПЕРВОЙ РОССИЙСКОЙ РЕВОЛЮЦИИ: ИСТОРИОГРАФИЯ ПРОБЛЕМЫ" .......... 92

**Гронскi А.Д.**
"РУССКИЕ РЕВОЛЮЦИОНЕРЫ НАЧАЛА XX В.: ПОПЫТКА ПСИХОЛОГИЧЕСКОГО ПОРТРЕТА" .......... 98

**Лiпецкi Э.А.**
"ЗАПАДНИЧЕСТВО И СЛАВЯНОФИЛЬСТВО В ДЕЯТЕЛЬНОСТИ ВЕДУЩИХ ПОЛИТИЧЕСКИХ ПАРТИЙ РОССИИ И БЕЛАРУСИ В НАЧАЛЕ XX В." .......... 104

**Старавойтаў М.I.**
"ЭТНИЧЕСКИЕ ГРУППЫ В УСЛОВИЯХ БЕЛОРУСИЗАЦИИ И УКРАИНИЗАЦИИ (20-30-Е ГОДЫ XX В.)" .......... 109

**Белаус М.Ф., Белаус С.М.**
"СЕЛЬСКОЕ ХОЗЯЙСТВО СССР И США В 30-Е ГГ. XX ВЕКА: МИФЫ И РЕАЛЬНОСТЬ" .......... 115

**Цобкала А.А.**
"АМЕРЫКАНСКАЯ ПУБЛIЦЫСТЫКА 1941 - 1945 ГГ. АБ ВЯЛIКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЕ САВЕЦКАГА САЮЗА СУПРАЦЬ ФАШЫСЦКАЙ ГЕРМАНII" .......... 121

**Шабельцаў С.В.**
"ПОЛИТИКА СОВЕТСКОГО ПОСОЛЬСТВА В БУЭНОС-АЙРЕСЕ ПО ОТНОШЕНИЮ К УКРАИНСКОЙ ДИАСПОРЕ В АРГЕНТИНЕ (40-Е ГОДЫ XX В.)" ........ 126

**Шабасава М.А.**
"СТАНОВЛЕНИЕ ОТНОШЕНИЙ МЕЖДУ РОССИЕЙ И ЕВРОСОЮЗОМ" ....... 132

**Півавар М.В.**
"МЕСЦА КРАЯЗНАЎСТВА Ў ГІСТАРЫЧНАЙ НАВУЦЫ І ДЗЯРЖАЎНАЙ ІДЭАЛОГІІ БЕЛАРУСІ, РАСІІ, УКРАІНЫ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XX СТ." .......... 138

**Субоцін А.Г.**
"РОССИЯ И "ФЕДЕРАТИВНЫЙ ВОПРОС" (СРАВНИТЕЛЬНО-ИСТОРИЧЕСКИЙ АНАЛИЗ)" ........ 144

***Секцыя 4*** ........ **148**

**ГІСТОРЫЯ ПАЎДНЁВЫХ І ЗАХОДНІХ СЛАВЯН** ........ **148**

**Александровіч С.С.**
"ДРЕВНИЕ СЛАВЯНЕ И АВАРЫ: СРАВНИТЕЛЬНЫЙ АНАЛИЗ ОСАДНОГО ДЕЛА ДВУХ ВАРВАРСКИХ НАРОДОВ" ........ 148

**Чарныш І.А.**
"СЕРБСКИЙ ИЕРУСАЛИМ: ПРОШЛОЕ И НАСТОЯЩЕЕ" ........ 154

**Траццяк Е.І.**
"ПОЛЬСКОЕ ПАТРИОТИЧЕСКОЕ ОБЩЕСТВО И МАСОНСКИЕ ЛОЖИ (ПРОБЛЕМА ВЗАИМОДЕЙСТВИЯ)" ........ 163

**Барадзіна М.С.**
"ПОЛЬСКАЯ ГІСТОРЫЯГРАФІЯ ПАЎСТАННЯ 1863 Г. НА МІНШЧЫНЕ" ... 168

**Цуба М.В.**
"РАЗВЯЗВАННЕ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ" ........ 172

**Федарасава В.Р., Ісаеў В.Ц.**
"ИДЕЯ ЕДИНСТВА ЮЖНЫХ СЛАВЯН (XIX - НАЧАЛО XX В.)" ........ 177

**Броўкін Е.А.**
"К ВОПРОСУ ОБ ЭФФЕКТИВНОСТИ ФИНАНСОВО-ЭКОНОМИЧЕСКИХ ПРОБЛЕМ МЕЖВОЕННОЙ ПОЛЬШИ 1920-Х ГГ. С ПОМОЩЬЮ ИНОСТРАННЫХ ЗАЙМОВ" ........ 181

**Еўдакімовіч А.Л.**
"ДВА ТЕЧЕНИЯ В МАКЕДОНСКОМ НАЦИОНАЛЬНО-ОСВОБОДИТЕЛЬНОМ ДВИЖЕНИИ И ПОЗИЦИЯ СССР (1919-1925 ГГ.)" ................. 186

**Яскевіч Л.І.**
"МЕЖДУНАРОДНОЕ ПОЛОЖЕНИЕ ПОЛЬШИ В 20-30-Х ГОДАХ XX ВЕКА" .... 162

**Мельнікау І.В.**
"НЕКАТОРЫЯ АСПЕКТЫ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСІ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XIX - ПАЧ. XX СТ. У ПРАЦАХ ПОЛЬСКІХ ГІСТОРЫКАУ ПЕРЫЯДУ ДРУГОЙ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ (1918 - 1939 ГГ.)" ..................... 196

**Барадзін С.П.**
"ДА ПЫТАННЯ ПРА МАГЧЫМАСЦЬ ДАПАМОГІ ВАРШАЎСКАМУ ПАЎСТАННЮ З БОКУ САВЕЦКАЙ АРМІІ" ..................... 201

**Салькоў А.П.**
"БУРГЕНЛАНД - УЗЕЛ НАЦИОНАЛЬНО-ТЕРРИТОРИАЛЬНЫХ ПРОТИВОРЕЧИЙ В ЦЕНТРАЛЬНОЙ ЕВРОПЕ (20-40-Е ГГ. XX В.)" .......... 206

**Паўлавец Ю.С.**
"ПРОБЛЕМА ЮГОСЛАВСКО-АЛБАНСКИХ ОТНОШЕНИЙ В 1941-1948 ГГ." ..... 212

**Лукашанец С.**
"НЯМЕЦКАЕ ПЫТАННЕ Ў НІЖНЯЙ СІЛЕЗІІ: ВЕРЫФІКАЦЫЯ І ДЭПАРТАЦЫЯ НЯМЕЦКАМОЎНАГА НАСЕЛЬНІЦТВА Ў 1945 - 1949 ГГ." ...... 218

**Козік Л.А.**
"РАССТАНОЎКА ПАЛІТЫЧНЫХ СІЛ Ў ПОЛЬШЧЫ НАПЯРЭДАДНІ РЭФЕРЭНДУМА 1946 Г." ..................... 233

**Пятроўская О.В.**
"БОЛГАРСКИЙ ОПЫТ АКАДЕМИЧЕСКОЙ АВТОНОМИ В КОНТЕКСТЕ ТРАНСФОРМАЦИИ ВЫСШЕЙ ШКОЛЫ (1990-Е ГОДЫ XX ВЕКА)" ............. 228

**Блізнец І.А.**
"ОТДЕЛЬНЫЕ АСПЕКТЫ ЮГОСЛАВСКОГО КРИЗИСА" ............................ 235

**Зміцровіч І.О.**
"СЕРБИЯ НАКАНУНЕ СЕНТЯБРЬСКО-ОКТЯБРЬСКОГО ПОЛИТИЧЕСКОГО КРИЗИСА 2000 Г." ..................... 239

**Малашук П.В.**
"СОТРУДНИЧЕСТВО РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ С ГОСУДАРСТВАМИ БЫВШЕЙ СОЮЗНОЙ ФЕДЕРАТИВНОЙ РЕСПУБЛИКИ ЮГОСЛАВИЯ (1991-2003 ГГ.)" ........ 244

**Малашук І.М.**
"КАНЦЭПТ САЛЯРНАСЦІ Ў ДУХОЎНАЙ КУЛЬТУРЫ СЛАВЯН" ........ 247

**Даўгяла М.С.**
"БОЛГАРО-РОССИЙСКИЕ ОТНОШЕНИЯ В КОНЦЕ XX-НАЧАЛЕ XXI ВЕКА" ..... 250

**Гатальская К.Г.**
"ПРАБЛЕМА СМЕРЦІ Ў ПОЛЬСКАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ" ........ 255

**Смірнова Е.Д.**
"ИСТОРИЯ ПОВСЕДНЕВНОСТИ В КОНТЕКСТЕ СОВРЕМЕННОЙ ИСТОРИ" ........ 260

**Лук'янаў П.Р.**
"СЛАВЯНСКИЕ СТРАНЫ ЦЕНТРАЛЬНОЙ И ЮГО-ВОСТОЧНОЙ ЕВРОПЫ В СОВЕТЕ ЭКОНОМИЧЕСКОЙ ВЗАИМОПОМОЩИ (СЭВ)" ........ 266